УДК 808.26 + 811.581

Н. У. Чайка
д-р філал. навук, праф. каф. мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка
e-mail: natusia12@tut.by

ПОЛІПРЭДЫКАТЫЎНЫЯ ТЫПЫ НЯПОЎНЫХ СКАЗАЎ У БЕЛАРУСКАЙ І КІТАЙСКАЙ МОВАХ

Разглядаюцца няпоўныя канструкцыі поліпрэдыкатыўнага тыпу ў беларускай і кітайскай мовах. Выяўлены і сістэматызаваны наступныя віды няпоўных канструкцый: з апушчаным дзейнікам, выказнікам, дапаўненнем (у беларускай мове) і з апушчаным азначэннем і прыназоўнікам (у кітайскай мове). Вызначаны спецыфічныя параметры тыпалогіі, што ўплываюць на тыпа- і відаўтварэнне няпоўных канструкцый, – парадак слоў і адсутнасць маркераў граматычнай формы. Сцвярджаецца, што фіксаваны парадак слоў і аўтаномны характар кампанентаў у кітайскай мове значна пашыраюць колькасныя паказчыкі структурных тыпаў.

Уводзіны

Праблема сінтаксічнай непаўнаты вывучалася на працягу ўсёй гісторыі мовазнаўства. У межах розных сінтаксічных школ і напрамкаў былі выпрацаваны метадалагічныя прынцыпы даследавання названай з’явы, зыходзячы з якіх канструкцыі атрымлівалі адпаведную кваліфікацыю. У даследаваннях прадстаўнікоў структурнай школы (Дж. Арма, Е. В. Грудзева, Сін Фуі, Гао Мінкай) свабоднае функцыянаванне няпоўных сказаў тлумачылася фактарам узаемадзеяння моўных адзінак розных узроўняў, што адкрывала перспектывы для іх комплекснага даследавання [1–4]. Тэарэтычныя асновы функцыянальнай сінтаксічнай школы (П. А. Лекант, Г. А. Золатава, Шао Цзінмінь, Ху Юйшу) дазвалялі тлумачыць камунікатыўную дастатковасць аналізуемых сказаў кампенсаторнымі магчымасцямі рознаўзроўневых моўных адзінак [5–8]. Тыпалагічныя асаблівасці структурна-сінтаксічных мадыфікацый у розных мовах закраналіся ў канцэпцыях Г. П. Мельнікава, А. В. Цымерлінга, Ван Вэйсяня, Чэн Чанлая і інш. [9–12].

Нягледзячы на значную колькасць работ па праблеме няпоўных канструкцый, застаюцца не вывучанымі тыпалагічныя ўласцівасці сінтаксічнай непаўнаты ў беларускай і кітайскай мовах. Актуальнасць падобнага даследавання абумоўлена прыналежнасцю да сучаснага перспектыўнага напрамку – супастаўляльна-тыпалагічнага вывучэння рознаструктурных моў, важнасцю падобнага даследавання для беларускай і кітайскай моў з мэтай удасканалення міжкультурнай камунікацыі, адсутнасцю ў навуковай літаратуры аналізу няпоўных сказаў у беларускай і кітайскай мовах, неабходнасцю выявіць структурныя тыпы няпоўных сказаў у азначаных вышэй мовах.

Мэта даследавання – выявіць поліпрэдыкатыўныя тыпы няпоўных канструкцый у беларускай і кітайскай мовах.

Функцыянаванне няпоўных канструкцый у беларускай і кітайскай мовах дазваляе выдзеліць іх універсальныя ўласцівасці (наяўнасць незамешчанай сінтаксічнай пазіцыі і магчымасць кампенсацыі апушчанага члена) і спецыфічныя (парадак слоў і характар сінтаксічнай сувязі ў іх). Азначаныя параметры пакладзены намі ў аснову класіфікацыі няпоўных канструкцый у беларускай і кітайскай мовах. Фіксаваны парадак слоў у кітайскай мове дазваляе выдзеліць спецыфічныя тыпы сказаў. На аснове названага параметра выдзяляюцца няпоўныя сказы поліпрэдыкатыўнага тыпу прэпазіцыйныя, у якіх кампенсаторны кампанент знаходзіцца перад няпоўным сказам. Таму прэпазіцыйныя і постпазіцыйныя няпоўныя сказы выдзяляюцца ў асобы сінтаксічны тып.

Магчыма выдзяленне няпоўнага сказа з прэпазіцыйным пропускам ***дзейніка*** ў якасці кампенсаторнага кампанента: **我想说我原谅他，但觉得说出来没多少意思，就打口不言**

(阿来, 《尘埃落定》, 第103页) (літар. *Я хацеў сказаць, што я дарую яму, але **(я)** падумаў, што ўжо не трэба, таму прамаўчаў*) і з постпазіцыйным: **东北大学那里有九十块钱薪水**, **每个月包天创还给他五十块钱津贴** (张洁, 《无字, 第116页) (літар. ***(У яго)** у Паўночна-ўсходнім універсітэце заробак 90 юаней, акрамя таго Цяньцінь даплачвае **яму** яшчэ 50 юаней дапамогі*). Гэта істотна адрозніваe кітайскую мову ад беларускай, дзе парадак слоў свабодны і не ўплывае на таксанамічныя класы канструкцый з незамешчанай сінтаксічнай пазіцыяй. Характар сінтаксічнай сувязі ў беларускай і кітайскай мовах абумоўлівае адрозненне ў тыпалогіі няпоўных сказаў у аналізуемых мовах. Адсутнасць маркераў сінтаксічнай сувязі дае магчымасць любому кампаненту, у тым ліку азначэнню і прыназоўніку, выконваць кампенсаторную функцыю. Гэта значыць, што структурныя класы няпоўных канструкцый у кітайскай мове будуць значна шырэйшымі.

У канструкцыях поліпрэдыкатыўнага тыпу ў якасці кампенсаторнага кампанента выступае матэрыяльна выражаны дзейнік адной з прэдыкатыўных частак, які з'яўляецца кваліфікацыйнай прыкметай – характарызуе канструкцыю як двухсастаўную.

У беларускай і кітайскай мовах выяўлены няпоўныя сказы поліпрэдыкатыўнага тыпу з кампенсаторным кампанентам ***дзейнікам***. Кампенсацыя апушчанага члена ажыццяўляецца на ўзроўні складанага сказа: *Нясоладка яму было: тры вайны адпляскаў... мнагавата. Ды і без вайны жыццё мёдам не было... І ад чужых, і ад сваіх нацярпеўся* (А. Дудараў). Сінтаксічная пазіцыя экспліцытна і імпліцытна выражаных членаў свабодная.

У кітайскай мове пазіцыя членаў у сказе фіксаваная, што дазваляе выдзяляць прэпазіцыйны і постпазіцыйны тыпы няпоўных сказаў з кампенсаторным кампанентам дзейнікам: **他开始爱风**, **爱日光**, **爱小动物**, **爱看人爬树打枣**, **甚至爱独自走到护城河畔放风筝** (曹禺, 《北京人》, 第28页) (літар. *Ён пачаў любіць вецер, любіць сонечны свет, любіць маленькіх жывёл, любіць назіраць, як людзі падымаюцца над дрэвамі, і нават сам пачаў гуляць па парку, запускаць паветранага змея*).

Поліпрэдыкатыўныя прэпазіцыйныя няпоўныя сказы ў кітайскай мове характарызуюцца зменай сінтаксічнай функцыі кампенсаторнага кампанента. Напрыклад, кампенсаторны кампанент, які паясняе апушчаны дзейнік, можа выконваць функцыю выказніка: **虽然我把主要精力用于数学**, **但并没有放弃古诗文的学习**, **时常写点诗**, **既丰富业务生活又练了自己的文笔**, **对于写作论文也有很大帮助** (《青年时报, 2015年, 第7期) (літар. *Хоць я прысвяціў сябе матэматыцы, але не адмовіўся ад вершаскладання, часта **пішу** вершы, **(працэс стварэння вершаў)** разнастаіць мой вольны час і развівае мае здольнасці, што дапамагае мне ў падрыхтоўцы дысертацыі*), азначэння: **我的话力这时大约有些凝滞了**, **坐着没有动**, **也没有想**, **直到看见分驻所里走出一个巡警**, **才下了车** (鲁迅, 《鲁迅全集》, 第5页) (літар. ***Мая** сіла ў гэты час прапала, не рухаўся і не думаў ні пра што, толькі калі ўбачыў паліцэйскага, што выходзіў з будынка, **я** выйшаў з машыны*).

Зрэдку ў кітайскай мове назіраюцца няпоўныя сказы поліпрэдыкатыўнага тыпу постпазіцыйныя, у якіх кампенсаторны кампанент знаходзіцца пасля няпоўнага сказа: **等退休了**, **我会把对家人的亏欠都补回来**, **是他们给了我最大的理解和支持** (《人民日报, 2016年, 第2期) (літар. *Калі **(я)** выйду на пенсію, **я** буду аддаваць увесь вольны час сям'і, бо менавіта сваякі разумеюць мяне і падтрымліваюць*).

Кампенсаторным кампанентам у няпоўных сказах поліпрэдыкатыўнага тыпу выступае матэрыяльна выражаны ***выказнік*** у адной з прэдыкатыўных частак няпоўнай канструкцыі: *Было неба то сіняе, то ружовае, / А пад ім малая хатка рыбака. / І было, як неба, возера шырокае, / Шумела там заўсёды асака* (М. Танк); *Ты, Хведзька, Хведар Паўлавіч, будзеш намі кіраваць, а мы – другімі!.. Пад тваім кіраўніцтвам. Будзем выконваць тваю жалезную волю і ўказанні* (А. Макаёнак).

У кітайскай мове кампенсаторным кампанентам выступае матэрыяльна выражаны выказнік у адной з прэдыкатыўных частак канструкцыі: **他考虑的从来都是家人**, **而不是自己** (家, 《巴金, 第27页) (літар. *Ён заўсёды думае пра членаў сваёй сям'і, а не пра сябе*

(думае)). Прыклады паказваюць, што няпоўныя сказы поліпрэдыкатыўнага тыпу з апушчаным выказнікам у беларускай і кітайскай мовах маюць аналагічную структуру.

Зрэдку назіраюцца няпоўныя сказы поліпрэдыкатыўнага тыпу з апушчаным ***дапаўненнем***. Кампенсаторным кампанентам у такіх сказах выступаюць экспліцытна выражаныя дапаўненні ў адной з прэдыкатыўных частак: *Я не хацела хмарыць сустрэчу, але калі ты так хочаш ведаць – дзядзьку майго арыштавалі. Антона* (І. Мележ).

Шырока прадстаўлены няпоўныя сказы поліпрэдыкатыўнага тыпу з апушчаным дапаўненнем у кітайскай мове. Выяўлены прэпазіцыйныя канструкцыі з паратаксічнай часткай злучнікавыя: **我想给他借点钱**, **可他就是不想借** (路遥《平凡的世界》, 第87页) (літар. *Я хачу пазычыць яму грошай, але ён не хоча браць **(грошы)***) і бяззлучнікавыя: **刚才还见火机掉在身边**, **现在横竖找不着** (刘震云,《一句顶一万句》, 第186页) (літар. *Толькі што я бачыў запалкі каля сябе, зараз не магу знайсці **(запалкі)***).

Выяўлены таксама няпоўныя складаныя сказы постпазіцыйныя злучнікавыя: **老赵还要一只**, **而且一只船不够划, 我也要划** (巴金,《春》, 第18页) (літар. *Патрэбны яшчэ адзін **(човен)**, аднаго чаўна не хапае, я таксама хачу катацца **(на чаўне)***) і бяззлучнікавыя: **这种苹果的味道真好**, **我还想吃** (周大星,《湖光山色》, 第187页) (літар. *Гэты яблык сапраўды смачны, я хачу з'есці **(яблык)***). Відавочна, што выдзяленне няпоўных поліпрэдыкатыўных канструкцый прэпазіцыйных і постпазіцыйных з'яўляецца спецыфічнай асаблівасцю кітайскай мовы, у якой структурная кваліфікацыя сказа абумоўлена фіксаваным парадкам слоў, а таксама абмежаваннем на распаўсюджанне дзеяння і наяўнасцю прыназоўніка, які выражае сінтаксічныя адносіны.

У кітайскай мове назіраюцца няпоўныя сказы з апушчаным азначэннем, што абумоўлена раўназначнасцю ўсіх сінтаксічных пазіцый у ім. Выяўлены няпоўныя сказы з паратаксічнай сувяззю злучнікавыя: **少平的班上有一个孩子**, **这孩子数学不错**, **但语文很差**, **连篇简单的作文也写不好** (路遥《平凡的世界》, 第169页) (літар. *У групе Шао Пінь ёсць хлопец, яго веды па матэматыцы неблагія, але **(яго)** веды па кітайскай мове дрэнныя, ён нават не можа напісаць адно простае сачыненне*) і бяззлучнікавыя: **他抽出里面的信**, **那一封封按照日期仔细排列的信**, **顺序也被打乱**, **还有几封更是没了踪影** (张洁,《无字》, 第46页) (літар. *Ён дастаў лісты, якія былі складзены ім па парадку, у адпаведнасці з датай, **(іх)** парадак быў парушаны, і некаторыя з іх зніклі*).

Сказы з гіпатаксічнай сінтаксічнай сувяззю маюць аналагічныя спосабы сувязі паміж часткамі – злучнікавую: **当然**, **这不仅和她是一个名人有关**, **还因为她从小到老**, **一言一行**, **总不符合社会规范** (张洁,《无字》, 第1页) (літар. *Канешне, гэта звязана не толькі з тым, што яна была знакамітай, а яшчэ з тым, што яна была старэйшай, **(яе)** словы і ўчынкі заўсёды былі несумяшчальныя з сацыяльнымі нормамі*) і бяззлучнікавую: **金波他父亲是地区运输公司的汽车司机**, **家庭情况比孙少平要好一些**, **生活方面在班里算是属于较高层次的** (路遥《平凡的世界》, 第4页) (літар. *Бацька Бо з'яўляецца кіраўніком транспартнай кампаніі рэгіёна, жыццёвы ўзровень **(яго)** сям'і лепшы, чым Шаопінь*).

У кітайскай мове можа апускацца ***акалічнасць***, якая выступае ў якасці кампенсаторнага кампанента. Назіраецца падобная з'ява ў складаных сказах злучнікавых: **女生宿舍里两排木板通铺**, **一边睡十个人**, **而另一边有门**, **睡八个人** (宗璞《东藏记》, 第58页) (літар. *У інтэрнаце ў дзяўчат – два рады дасок, дзесяць чалавек спяць на адным баку, на другім баку – дзверы, **(там)** спіць восем чалавек*); **她从家里搬来了一盆花**, **而他直接搬来了一张床** (张洁,《无字》, 第89页) (літар. *Яна прывезла гаршчок з кветкамі з дома, а ён прама (з дома) перавёз канапу*) і бяззлучнікавыя: **我以前常常来这儿看书**, **现在不了** (路遥《平凡的世界》, 第74页) (літар. *Я раней часта прыходзіў сюды і чытаў кнігі, зараз не **(прыходжу сюды)***).

Акалічнасць з'яўляецца абавязковым кампанентам у структуры сказа кітайскай мовы, што дазваляе яму выконваць кампенсаторную функцыю. Сказы з гіпатаксічнай сінтаксічнай сувяззю маюць аналагічныя спосабы сувязі паміж часткамі – злучнікавую: **我不去那儿**, **我这里的事多着呢**, **而且——离你们那样远** (宗璞《东藏记》, 第99页) (літар. *Я не пайду туды, у мяне тут многа спраў, і **(тое месца)** далёка знаходзіцца ад вас*) і бяззлучні-

кавую: **昨天他们都来公司开会**, **他一个人没来** , **说是家里有事** (宗璞《东藏记》, 第111页) (літар. *Учора яны ўсе былі на сходзе, адзін чалавек не прыйшоў* ***(на сход)****, сказаў, што былі хатнія справы*).

Акалічнасць у кітайскай мове можа ўказваць на прычыну: **为了找工作他在人才市场呆了一个多月**, **而她投了一百多份简历** (阿乙,《灰故事》, 第78页) (літар. *Каб знайсці працу, ён стаяў на ўліку на рынку працы больш месяца, а яна адправіла больш за 100 рэзюмэ* ***(каб знайсці працу)***), час: **我明天去北京看望朋友**, **或者去天津帮林林找份工作**… (李佩甫,《生命册》, 第85页) (літар. *Я заўтра еду ў Пекін наведаць сяброў або* ***(заўтра)*** *у Цяньцзінь шукаць працу для сястры*), месца: **我本来打算自己去学校**, **但是哥哥说送我去** (周大新,《湖光山色》, 第93页) (літар. *Я спачатку збіраўся сам пайсці ў школу, але старэйшы брат сказаў, што ён правядзе мяне* ***(ў школу)***).

Акалічнасць з'яўляецца абавязковым кампанентам у структуры сказа кітайскай мовы, што дае яму магчымасць выконваць кампенсаторную функцыю.

У якасці кампенсаторнага кампанента ў кітайскай мове можа выступаць ***прыназоўнік***, таму сказы з пропускам прыназоўніка ўтвараюць асобны структурны тып. Прыназоўнікі належаць да службовых часцін мовы, якія выражаюць суб'ектна-аб'ектныя, прасторавыя, часавыя, мэтавыя і прычынныя адносіны. Спецыфіка кітайскіх прыназоўнікаў заключаецца ў тым, што яны з'яўляюцца дэрыватамі дзеясловаў – некаторыя з іх у працэсе граматызацыі набылі прасторавыя часава-трывальныя формы адпаведных дзеясловаў, пры гэтым яны яшчэ і захоўваюць некаторыя іх сінтаксічныя ўласцівасці. Напрыклад, прыдзеяслоўнае адмаўленне ў кітайскай мове адносіцца да прэпазіцыйных прыназоўнікаў, гэта значыць ён можа выступаць функцыянальным аналагам дзеяслова.

Дэтэрмінаваныя прыназоўнікі ў кітайскай мове валодаюць значнай ступенню самастойнасці, могуць адносіцца да сказа ў цэлым: **这个嘛**, **我没办法答应你不告诉别人** (《北京青年报》, 1991年第2期) (літар. *Я не магу абяцаць табе, што не скажу* ***(пра)*** *гэта іншаму чалавеку*). Прыназоўнік у дадзеным сказе кваліфікуе форму дапаўнення, паколькі дзеяслоўнае кіраванне ў кітайскай мове адсутнічае.

Прыназоўнікі, што ўжываюцца ў якасці кампенсаторнага кампанента, выражаюць адносіны прасторавыя: **我在几个月的时间里**, **逛遍了河北岸的几个小区**, **树林、花园、大小超市、药店**.. **都留下了我的足迹** (莫言,《蛙》, 85) (літар. *У апошні час я прагульваўся па ўсіх раёнах Хэ Бэй –* ***(па)*** *лесе,* ***(па)*** *парку,* ***(па)*** *вялікіх і малых магазінах…*), часавыя: **去年**, **也就是去年秋天**, **他在办公室里坐着**, **看院子里的树叶落了**, **满地黄叶**, **金灿灿的** (李佩甫, «生命册», 第196页) (літар. ***(У)*** *мінулым годзе, восенню, ён з вакна кабінета бачыў, як з дрэў злятала лісце – жоўтае, залатое*).

Заключэнне

На аснове праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы. У беларускай і кітайскай мовах выяўлены тыпы поліпрэдыкатыўных няпоўных сказаў – з апушчаным дзейнікам, выказнікам, дапаўненнем і з акалічнасцю, азначэннем і прыназоўнікам – у кітайскай. Прадстаўленая класіфікацыя зроблена намі на аснове спецыфічных параметраў тыпалогіі – парадку слоў і характару сінтаксічнай сувязі кампанентаў у сказе.

Фіксаваны парадак слоў у кітайскай мове дазваляе выдзеліць у ім спецыфічныя структурныя тыпы няпоўных сказаў – поліпрэдыкатыўны з кампенсаторным кампанентам дзейнікам прэпазіцыйны і постпазіцыйны, поліпрэдыкатыўны з кампенсаторным кампанентам дапаўненнем прэпазіцыйны і постпазіцыйны. Кваліфікацыя і выдзяленне наступных тыпаў значна пашырае колькасныя паказчыкі структурных тыпаў у кітайскай мове.

У кітайскай мове адсутнічаюць маркеры сінтаксічнай сувязі кампанентаў сказа, што вызначае іх характар – раўназначны і аўтаномны. Гэта значыць, што названыя кампаненты могуць самастойна выконваць кампенсаторную функцыю, а значыць утвараць тып. У кітайскай мове ў якасці кампенсаторнага кампанента выступаюць як галоўныя

члены сказа, так і дапаўненні, акалічнасці, азначэнні і прыназоўнікі, якія акрамя дыферэнцыяцыі сінтаксічнай паўнаты-непаўнаты утвараюць таксанамічны клас.

У кітайскай мове назіраецца магчымасць кампенсаваць пропуск члена сказа семантычна тоесным кампанентам без уліку граматычнай формы і маркіроўкі, што абумоўлена іх сінтаксічнай раўназначнасцю. Гэта адкрывае магчымасці для змены структурнага статусу членаў сказа і ўтварэння іх бінарных парадыгм, якія прадуцыруюць фарміраванне спецыфічных тыпаў і відаў няпоўных канструкцый у кітайскай мове.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Harma, J. Sur l'omission du verbe et sa recuperabilité en français / J. Harma // Actes du 9e Congrès des romanistes scandinaves, Helsinki, 13–17 aout 1984. – Helsinki, 1986. – P. 135–146.

2. Грудева, Е. В. Избыточность и эллипсис в русском письменном тексте / Е. В. Грудева. – Череповец : Череповец. гос. ун-т, 2007. – 251 с.

3. 邢福义 现代汉语/ 邢福义 – 北京:高等教育出版社, 1991. – 560页(Син, Фуи. Современный китайский язык / Син Фуи. – Пекин : Изд-во Высш. образования, 1991. – 560 с.).

4. 高名凯 汉语语法论/ 高名凯 – 北京:商务印书馆, 1986. – 557页(Гао, Минкай. Исследование грамматики китайского языка / Гао Минкай. – Пекин : Коммерч. изд-во, 1986. – 557 с.).

5. Лекант, П. А. К проблеме неполных предложений в русском языке / П. А. Лекант // Учен. зап. Моск. обл. пед. ин-та. – 1963. – Т. 139, вып. 9 : Рус. яз. и лит. – С. 43–49.

6. Золотова, Г. А. К вопросу о неполных предложениях / Г. А. Золотова // Русский язык : сб. тр. : посвящ. памяти д-ра филол. наук, проф. Н. Н. Прокоповича / Моск. гос. пед. ин-т ; редкол.: Л. Ю. Максимов [и др.]. – М., 1975. – С. 106–118.

7. 邵敬敏 汉语语法专题研究 / 邵敬敏 – 桂林:广西师范大学出版社, 2003. – 220页 (Шао, Цзинминь. Исследование по специальной теме в грамматике китайского языка / Шао Цзинминь. – Гуйлинь : Изд-во. Пед. ун-та Гуанси, 2003. – 220 с.).

8. 胡裕树 现代汉语 / 胡裕树 – 上海:上海教育出版社, 561页 (Ху, Юйшу. Современный китайский язык / Ху Юйшу. – Шанхай : Шанхайс. изд-во образования. – 561с.).

9. Мельников, Г. П. Системная типология языков: принципы, методы, модели / Г. П. Мельников ; Рос. акад. наук, Ин-т языкознания. – М. : Наука, 2003. – 393 с.

10. Циммерлинг, А. В. Типологический синтаксис скандинавских языков / А. В. Циммерлинг. – М. : Яз. славян. культуры, 2002. – 895 с.

11. 王维贤 现代汉语语法理论研究 / 王维贤 – 北京:语文出版社, 1997. – 300页 (Ван, Вэйсянь. Теоретическая грамматика современного китайского языка / Ван Вэйсянь. – Пекин : Изд-во кит. яз., 1997. – 300 с.).

12. 陈昌来 现代汉语句子 / 陈昌来 – 上海 华东师范大学出版社, 2000. – 313页 (Чэн, Чанлай. Современные китайские синтаксические системы / Чэн Чанлай. – Шанхай : Изд-во Восточ.-кит. пед. ун-та, 2000. – 313 с.).

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 25.10.2019

Chaika N. U. **Polypredicative Types of Elliptical Sentences in Belarusian and Chinese Languages**

The article is devoted to studying of the polypredicative types of elliptical sentences in Belarusian and Chinese languages. The following types of elliptical sentences have been revealed and systematized in Belarusian and Chinese languages: the sentences with omitted subject, predicate, object and with omitted attribute and prepositions in Chinese. The specific parameters of typology, which affect the type and kind formation of the elliptical sentences, have been defined. These parameters include the word order and the lack of grammar meaning markers. It is found out that the fixed word order and the autonomous nature of the components in the Chinese language significantly increase the quantitative indicators of structural types.